Падтрымай "Вясну" на PATREON

Што хочуць схаваць ад грамадскасці на нарадах, прысвечаных выбарам?

дапоўнена

10.09.2019 **Тэгі**: выбары-2019



Інфармацыйны стэнд прысвечаны выбарам 2019 году.

У Магілёве і Віцебску 10 верасня праходзяць нарады з удзелам кіраўніцтва ЦВК, прадстаўнікоў аблвыканкама, старшыняў тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій. Гледзячы на склад удзельнікаў гэтых нарадаў, размова будзе весціся аб арганізацыі выбарчага працэсу па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў.

Доўгатэрміновы назіральнік кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” **Аляксей Колчын** паспрабаваў патрапіць на гэтыю напаўсакрэтную нараду і вось што з гэтага выйшла:

> *“Сакратарка абласной камісіі **Людміла Макаранка** паведаміла, што нараду праводзіць аблвыканкам, аднак дазволіла прайсці ў залу пасяджэнняў. На ўваходзе у залу адбывалася рэгістрацыя прысутных. Спачатку прапускаць не хацелі, казалі што допуск толькі праз абласную камісію. Я спаслаўся на Макаранку і мяне прапусцілі. Але за 5 хвілін да пачатку пасяджэння падыйшоў супрацоўнік аддзелу арганізацыйна-кадравай работы аблвыканкама **Дзмітрый Цімафеенка** і папрасіў пакінуць залю. Маўляў, гэта не пасяджэнне АВК, а нарада аблвыканкаму і прысутнасць назіральнікаў не прадугледжана”*, - распавядае Аляксей Колчын.

Падобная карціна складваецца і ў Віцебску, дзе на нараду з удзелам сакратара ЦВК **Алены Дмухайла** таксама не дапусцілі назіральнікаў.

> *“Пропуск строга па спісах, складзеных аблвыканкамам. Мерапрыемства цалкам закрытае і ад назіральнікаў, і ад іншых сябраў камісій, у тым ліку, абласной. Мы тройчы выклікалі Дмухайла. З другога паверха Алена Мікалаеўна не спусцілася”*, - каментуе назіральніца **Ірына Траццякова.**

Назіральніца адзначае, што довады, якія пацвярджаюць абсурднасць дзеянняў службовых асобаў Віцебскага аблвыканкама, ігнараваліся супрацоўнікамі аблвыканкама. Забаранілі прысутнічаць на мерапрыемстве нават члену Віцебскай абласной камісіі **Паўлу Левінаву**.

Такім чынам, лічыць Ірына Траццякова, прадстаўнікі ўлады паказалі, што незацверджаныя «спісы запрошаных» маюць большую юрыдычную сілу, чым Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Выбарчы кодэкс і Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь».

Паколькі такога кшталту мерапрыемства адбываецца ў рамках падрыхтоўкі да правядзення выбараў, якое праводзіць Цэнтральная камісія сумесна з выканаўчымі ўладамі, слушна, каб яно праходзіла адкрыта і галосна, з удзелам прадстаўнікоў грамадскасці, адпаведна з прынцыпам галоснасці ўказаным, скажам, у арт.3 “Закона аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў РБ”.

> *“Так, гэта не паседжанне выбарчых камісій, на якіх мае права прысутнічаць назіральнік, але мы, як прадстаўнікі грамадскасці, можам прысутнічаць на гэтай нарадзе. Тым больш, калі яна прысвечаная выбарам, а ўсе, што датычыць выбараў павінна быць галосным і адкрытым. Інакш могуць узнікнуць падазрэнні, што ўладам ёсць што ад нас хаваць”,* - каментуе падзеі юрыст **Валянцін Стэфановіч.**

"Праваабаронцы за свабодныя выбары".

Навіны кампаніі ў фэйсбуку, твітэры і на Тэлеграм-канале.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Мужа і жонку з Дзяржынска асудзілі па групавым фотаздымку з акцыі пратэсту

Апазналі па відэа з дзіцём на руках. Экс-следчага і ягоную жонку асудзілі за ўдзел у акцыях пратэсту

У Мінску адразу пяці чалавекам прызначылі па году калоніі за ўдзел у акцыях пратэсту

Жыхарку Фаніпаля асудзілі за ўдзел у акцыі пратэсту з белай стужкай

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Мой статус быў "злосны парушальнік". Леанід Судаленка — пра зняволенне, ад'езд з Беларусі і салідарнасць

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

Памёр палітзняволены мастак Алесь Пушкін (дапоўнена)



ГАЛОЎНАЕ

Як пераследуюць беларусаў за камунікацыю з "экстрэмісцкімі" медыя



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява беларускіх праваабарончых арганізацый у сувязі з прызнаннем "Вясны" экстрэмісцкім фармаваннем

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні 17 чалавек палітычнымі зняволенымі

Жыхара Смалявіцкага раёна за ўдзел у нядзельным маршы пратэсту асудзілі да "хатняй хіміі"

"Маючы пры сабе атрыбутыку – сцяг бел-чырвона-белага колеру, выказваў свае грамадска-палітычныя погляды"

Супрацоўніцу БНТУ асудзілі па "народным" артыкуле за ўдзел у акцыях пратэсту

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Стаў вядомы прысуд вядомаму сталічнаму самелье Аляксандру Кульбачку

За абразу Лукашэнкі ў Мінску асудзілі кіроўцу

Баранавіцкага пенсіянера асудзілі за абразу Лукашэнкі і супрацоўніка міліцыі (далейшае)

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Ліпень 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY